На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 136 (258)

Субота, 9 жніўня 1997 г.


Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах

Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Выдавец — ТАА "Народная воля"

Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля



Сонца

	Усход	Захад
Віцебск	5.20	20.48
Магілёў	5.25	20.43
Гомель	5.27	20.35
Мінск	5.35	20.54
Гродна	5.51	21.08
Брэст	5.58	21.03

Першая квадра 11 жніўня.

Трудный вопрос

Ари Косто спросил президента: "Диалог вести будем?" В ответ прозвучали намеки о вероятности помилования Шеремета, выборов парламента и отставки Антоновича

Людмила МАСЛЮКОВА,
политический обозреватель "Народной воли"

В ходе официальной встречи с Александром Лукашенко специальный представитель Европейского Союза по Беларуси Ари Косто намеревался получить ответ на вопрос о судьбе трехсторонних консультаций, которые фактически были сорваны в третьем раунде. Высокий гость услышал от президента заверения в том, что он всячески заинтересован продолжать диалог и с нетерпением ждет от рабочей группы результатов.

Между тем дотошным наблюдателям из надежных источников хорошо известно, что на переговорах о совершенствовании Конституции 1994 года представители президента получили установку "валять Ваньку". В минуту повышенного раздражения президент, по имеющимся сведениям, дал сигнал оборвать диалог, отчего у его исполнителей кругом пошли и без того замороченные головы. Теперь, стало быть, официальный Минск вернулся к прежней стратегии: волынить насколько возможно.

Ари Косто, в отличие от наблюдателей, по статусу своему обязан воспринимать слова президента в том единственном прямом значении, которое они имеют. На пресс-конференции в Посольстве Великобритании представитель Евросоюза, базируясь на заверениях Александра Лукашенко, спрогнозировал, что 9 сентября текущего года рабочая группа сядет за "круглый стол" и приступит к делу, что к концу октября предложения о надлежащем балансе трех ветвей власти будут сформулированы и предложены стране.

Ни жестом, ни интонацией европейский политик не выразил скепсиса по поводу своего столь оптимистичного прогноза. Сатира коренилась не в словах или дипломатических оборотах речи, а в парадоксальности всей ситуации вокруг конституционного реформирования, которая, конечно же, понятна арбитрам диалога между президентом и Верховным Советом 13-го созыва. Будут ли реализованы предложения, подчеркнул Косто, это уже внутреннее дело суверенной Беларуси.

О независимости с гордостью говорил гостю и Александр Лукашенко: "...мы не приемлем никакого давления извне, ни с Запада, ни с Востока. События последних дней должны были вас в этом еще раз убедить". Едва прикрытая озлобленность, слегка завуалированная угроза, готовность в агрессии по малейшему поводу легко улавливаются в тираде.

Косто и Лукашенко говорили долго, полтора часа, но, есть основания полагать, говорили на разных языках — в прямом и переносном смысле.

Журналистам нет необходимости соблюдать политес, они имеют возможность судить о происходящем, проясняя его, а не запутывая.

Так вот, диалог о трехсторонних переговорах был мучительным, пустым и безрезультатным. Что он дал практически?

Команда европейцев во главе с Мэттью Расселом напишет письмо руководителю президентской группы, министру иностранных дел Ивану Антоновичу, чтобы узнать, согласен ли он приступить, наконец, к совершенствованию Конституции 1994 года. Если Антонович согласится — вызовет приступ гнева у Лукашенко, которого бесит само понятие "Конституция 1994 года". Если Антонович не согласится — Ари Косто заявит о том, что министр нарушает волю своего президента к прогрессу переговоров.

Чиновник, которого журналисты наградили прозвищем Ванька-встанька, теряет устойчивость, хотя особенность игрушки в том и заключается, что она обладает низко расположенным центром тяжести: как ее ни валяй — торчит торчком. Однако не ровен час, потеряет Иван Антонович замечательное свойство, а его вероятная отставка может стать единственным практическим следствием переговорного процесса. За неприкосновенность своей Конституции 1996 года президент отдаст, если потребуется, не то что одного, а дюжину министров.

Правильность прогноза о неизбежности перевыборов карманного Национального собрания подтверждает и состоявшаяся встреча Лукашенко и Косто. Собеседники обсуждали проблему новых выборов парламента, о чем, естественно, умолчало государственное телевидение, но рассказал на пресс-конференции специальный представитель Европейского Союза. И этот вроде бы попутный мотив имеет весьма серьезное значение. Никакой Европе белорусский президент не позволит затрагивать узурпированную им власть, но ему ничего не стоит расплатиться с Западом двухпалатным недоразумением со всем его человеческим содержимым.

Подспудно, в подтексте, шел политический торг: Лукашенко для ублажения Европы прогонит новых депутатов через округа, откалибровав их по своему усмотрению, а за это Запад вернет ему имидж демократа.

В беседе с европейцем президент опять сетовал на свой несправедливо плохой имидж в прессе дальнего зарубежья. Косто предложил поправить его немедленно: "Сделайте жест доброй воли, выпустите из тюрьмы журналиста Шеремета!" Лукашенко стал ссылаться на Уголовный кодекс и заявил, что самое большее, что он вправе сделать в этой ситуации, — после суда простить российских журналистов, помиловать Шеремета.

А как еще режим может разрубить гордиев узел "шереметова дела", которое сшито так грубо, что, говорят, гродненские следователи, вляпавшиеся в политический процесс без единого доказательства вины подследственного, изъясняются о нем между собой по-простонародному — только матом? Намек на такой исход процесса интересный и брошен, наверное, не на ветер.

По совокупности получается, что диалог Александра Лукашенко и Ари Косто прояснил что угодно, но только не конкретную проблему трехстороннего переговорного процесса. Выходит, что на свой прямой вопрос президенту "Диалог вести будем?" Европейский Союз в ответ получил намеки на вероятность помилования Шеремета, выборов парламента и отставки Антоновича.

Заўтра — Дзень будаўніка. Віншуем!



Прыгожая панарама, праўда? А гэта ж справа рук беларускіх будаўнікоў...

Мечеславу Грибу отказано в лицензии... и праве защищать Конституцию

Экс-спикер Верховного Совета Беларуси 12-го созыва Мечеслав Гриб продолжает борьбу за выдачу ему лицензии о занятии адвокатской деятельностью. Конфликт возник, что называется, на голом месте, и в ближайшее время он должен стать предметом рассмотрения в Московском райсуде Минска. 6 августа Мечеслав Гриб подал иск на Министерство юстиции, которое, по мнению депутата, несправедливо отказывает ему в переаттестации.

Со слов Мечеслава Гриба, экзаменационная комиссия Минюста, в компетенции которой определять, достаточны ли знания для адвокатской деятельности, посчитала его багаж знаний вполне удовлетворительным. В том, что лицензия будет выдана, не сомневался и заместитель министра юстиции г-н Голованов. Однако в назначенный срок — 11 июля — документ чиновники не подготовили, сославшись на техническую недоработку. Спустя еще одиннадцать дней лицензия находилась на подписи у министра Г. Воронцова. Наконец 30 июля М. Гриб узнал из прессы, что ему отказано в выдаче лицензии ввиду того, что он принимал участие в санкционированном шествии в День Конституции, а это, по мнению министра, несовместимо с высоким званием адвоката. Отчаявшись получить "адвокатскую" лицензию, экс-спикер прибегнул к последнему законному способу отстоять свои права — подал иск в суд, хотя и сейчас не питает иллюзий по поводу восстановления справедливости, полагая, что решение спущено Г. Воронцову сверху, а коли так, то и суд вряд ли защитит от произвола. Таковы справедливость и правосудие. У нас...

Сергей ПУЛИНЕЦ.

Поверили?

Если в Вильнюсе лишь предполагают, то в Минске и Гродно уже располагают. "Доказуемыми" фактами, увиденными... по телевизору. Глазами Садкаускаса...

Чтобы каким-то образом оправдать арест съемочной группы ОРТ, официальная пропаганда несколько дней трезвонила: о нарушении границы поставила вопрос литовская сторона.

Хотя и свежо было преданье, но верилось с трудом. Было желание увидеть обращение-заявление командира Вильнюсского отряда пограничной полиции собственными глазами. И вот такая возможность представилась. Что же на самом деле писал погра ничный представитель Литовской республики на границе с Республикой Беларусь по Вильнюсскому участку (он же командир отряда пограничной полиции) А.Садкаускас своему белорусскому коллеге подполковнику В.Скоблю? Итак, читайте датированное 26 июля 1997 года заявление из Вильнюса (орфография сохраняется):

"Уважаемый господин пограничный представитель

23.07.1997 г. по телеканалу ОРТ в программе "Время" был показан сюжет об Литовской — Белорусской границе. На старой дороге Вильнюс — Минск. В том материале четко было видно режимные объекты (шлагбаум, будка поста "Медининкай-2") на территории Литовской Республики. Данные объекты принадлежат Департаменту пограничной полиции Литовской Республики, на съёмку которых нужно разрешение. В этом случае она бы была согласована и также было видно, что съемка велась с территории Литовской Республики, что является грубым нарушением пограничного режима.

***Предполагаю** (выделено мною — В.С.), что была нарушена государственная граница Литовской Республики со стороны Республики Беларусь.*

Прошу Вас, Господин пограничный представитель, осуществить разбирательство по данному случаю, о результатах которого письменно сообщить Литовской стороне.

С уважением..."

Командир литовского отряда пограничной полиции лишь предположил, что была нарушена граница Литовской республики со стороны Беларуси. А в Минске это уже приняли за свершившийся факт. Данность. Господин А.Садкаускас и вовсе не отрицает, что возможное нарушение он обнаружил... по телеканалу ОРТ. Его же белорусские коллеги рассуждают более определенно и категорично.

Выходит, сам факт пересечения белорусско-литовской границы группой ОРТ еще предстоит доказать. Съемки могли производиться как в непосредственной близости, так и на расстоянии. Об этом лучше судить специалистам или назначенным экспертам. Неслучайно Павел Шеремет, посоветовавшись с адвокатом, направил ходатайство на имя Генерального прокурора Беларуси о передаче ведения следствия литовским правоохранительным органам. Не сложно предположить, что подследственный и его адвокат Гарри Погоняйло, участвующий, кстати, в защите по делу Тамары Винниковой, пошли на этот шаг во имя объективного рассмотрения свершенного его очередным подзащитным П.Шереметом и сотоварищами (Д.Завадским и Я.Овчинниковым). От предвзятого же рассмотрения "дела Шеремета и К^0" в суде застраховаться, пожалуй, невозможно. Белорусские власти, в частности МИД, аннулировавший аккредитацию руководителя бюро ОРТ в Минске, еще раз подтвердили свою решимость в борьбе с "нячэснымі" журналистами: отступать от принятых правил игры не позволят никому.

Прочтение заявления командира Вильнюсского отряда пограничной полиции А.Садкаускаса наводит и на другую мысль. Ну очень бдительно охраняется у нас белорусско-литовская граница. Как с одной, так и с другой стороны. А может, между когда-то братскими советскими республиками, привыкшими более полувека жить без границ, так и должно быть? Если нет, то не лучше ли властям за чрезмерное служебное "рвение" привлечь к ответственности господ начальствующих пограничников? А не журналистов, рассказавших правду о границе, которая охраняется, по их мнению, из рук вон плохо. А разве не так?

Виктор СВИРКО.

Слышали?

Впервые за три года у Александра Лукашенко в столице республики больше противников, чем сторонников

В распоряжении "Народной воли" находятся результаты последних социологических исследований, проведенных Минским научно-исследовательским институтом социально-экономических и политических проблем. Этот институт был создан по решению Мингорисполкома в конце 1993 года и в основном выполняет заказы своего учредителя.

Исследования, о которых мы расскажем ниже, проводились в мае—июле нынешнего года по теме "Общественно-политическая ситуация в Минске и прогноз ее развития". Анкетированием были охвачены около тысячи человек.

Бесспорно, сенсацией стали ответы на вопрос "Доверяете ли вы президенту Беларуси?". В процентном отношении на него получены следующие результаты:

"да" — 35;
"нет" — 37;
"трудно сказать" — 27;
"нет ответа" — 1.

Таким образом, впервые за три года в столице республики оказалось больше людей, которые не доверяют, чем доверяют Александру Лукашенко. На эти результаты можно смотреть двояко: пессимист скажет, что Минск — это не вся республика, что президента традиционно больше поддерживает село. Оптимист заметит — все процессы в Беларуси начинаются со столицы, постепенно охватывая периферию. Кто будет прав в этом споре, покажет время, но уже сегодня, основываясь на том, что цифры красноречивее слов, можно утверждать: для президента прозвучал тревожный звоночек.

Об этом говорят и результаты анкетирования по такому вопросу: "Сравнивая нынешнюю политическую ситуацию с периодом до избрания первого президента республики в 1994 году, как бы вы ее оценили?" (в процентах):

"стала лучше, благоприятнее прежней" — 20;
"такая же" — 20;
"стала хуже" — 43;
"затрудняюсь ответить" — 16;
"нет ответа" — 1.

Кстати, виновным в том, что политическая ситуация в столице республики не совсем благополучная, прежде всего считают президента Лукашенко — 36 процентов. Для сравнения: правительство обвиняют 26 процентов опрошенных, криминально-мафиозные структуры — 23 процента, оппозицию — 19... К слову, сам факт наличия оппозиции в обществе положительно оценивают 45 процентов респондентов, отрицательно — 23 процента.

Четко обозначилось и отношение минчан к экономическим реформам. 51 процент опрошенных считают, что их нужно продолжать, и только 9 выступают за их прекращение.

И уж никак нельзя обойтись в этом коротком обзоре без цифр по такому вопросу: "Какая система выдвижения руководителей местной власти, на ваш взгляд, предпочтительнее?" (в процентах):

"глава местной власти назначается президентом" — 15;
"глава местной власти избирается населением соответствующей территории" — 70;
"глава местной власти избирается местным советом" — 11;
"нет ответа" — 4.

Любопытнейшая получается картина: во всех социологических опросах, проведенных как до, так и после ноябрьского референдума 1996 года, население республики высказывается за избрание, а не назначение руководителей местной власти. А вот во время референдума почему-то люди проголосовали иначе. Почему?

Владимир КОТ.

Погляд

Людміла МАЙСЕНЯ

Прышчэпка сталінізму

Разам з "Чаромхай" з балончыкаў у Беларусі выразна запахла сталінізмам. І гэта стала непазбежным з моманту, калі тры гады назад насельніцтва выбрала прэзідэнта, які адным з пунктаў сваёй дзейнасці абвяшчаў барацьбу "с теми, кто развалил Союз", з нацыяналістамі... У выніку такога падыходу Сталін як кумір павінен быў легалізавацца да арыенціра ў высокай палітыцы значна раней — услед за прыдуманым у сталінскі перыяд дзяржаўным сцягам. Аднак на сітуацыю нечакана паўплываў госць з газеты "Handelsblat", з-за чаго першай у Беларусі з'явілася здань германскага аўтара "Mein Kampf". І ўжо пасля па яго сцяжыне пайшоў дух "отца всех народов". Але логіка беларускіх падзей ад гэтага значна не парушылася, як не парушаецца сума ад перастановы двух складнікаў. Ды і ўвогуле, як зразумела ўсяму цывілізаванаму свету, выявы абодвух памянёных палітычных "аўтарытэтаў" могуць быць гарманічна нанесены на два бакі адной і той жа ідэалагічнай "манеты". Толькі вось наўрад ці знойдзецца дзяржава, якая б пажадала выпусціць яе для афіцыйнага ўжытку. Акрамя? Акрамя найлепш вядомай нам.

Першую прышчэпку сталінізму ў новай краіне Рэспубліка Беларусь можна было ўбачыць 9 мая 1995 года — падчас святкавання 50-годдзя з дня перамогі над фашызмам. Ужо тады, за 5 дзён да "рэферэндуму №1", пачалося паляванне на яшчэ дзяржаўны бел-чырвона-белы сцяг у маладых руках. І ўжо тады немаладыя рукі абсалютна легальна і ганарова неслі ў калоне партрэт ганебнага дыктатара, за перыяд кіравання якога былі знішчаны сотні тысяч лепшых нашых суайчыннікаў. **Гэта быў знак нашай немінучай бяды.** Знак, які выразна паказваў, што святкаваць перамогу над фашызмам яшчэ рана.

Хто той сівы чалавек, які нёс партрэт Сталіна? Ці быў ён актыўным удзельнікам сталінскіх акцый? Ці браў удзел у сяброўскім брэсцкім парадзе гітлераўскай і Чырвонай армій у верасні 1939 года, калі вайна ўжо палыхала ў Еўропе? Ці падымаўся ў атаку шэрагоўцам ці, наадварот, падганяў шэрагоўцаў у складзе СМЕРШа? Ці адпраўляў ваеннапалонных "здраднікаў Радзімы" з нямецкіх канцлагераў у савецкія? Ва ўсялякім разе зразумела, што ён захаваў найлепшыя пачуцці да таго рэжыму і яго істота працягвае быць знітаванай з палітыкай татальнага знішчэння ўласнага народа.



Глядзець на гэты трагічны нонсэнс у светлы гістарычны дзень было нясцерпна. У калоне пераможцаў над гітлерызмам адбывалася ўзнёслае вяртанне сталінізму. Зноў пачынаўся перыяд уваскрэсення асобы, на якой таксама ляжыць адказнасць за перадзел Еўропы і распальванне страшэннай вайны.

Прышчэплены пасынак прыжыўся: партрэты Сталіна множыліся і множыліся ад адной "чырвонай" акцыі да другой. **У беларускай палітычнай прыродзе пачалі насоўвацца сталінскія прыщемкі.** Не хапала толькі аднаго — яўнага сігналу з найвысокай трыбуны. І такое адбылося 26 сакавіка 1997 года на рэспубліканскай селектарнай нарадзе па пытаннях падрыхтоўкі да пасяўной. Усебеларускай аўдыторыі было даведзена, што ідуць просьбы "давай, президент, диктатуру, давай сталинские времена". Толькі вось афіцыйнага адмежавання ад такой палітыкі мы не пачулі. Тыя ж, хто прасіў, атрымалі надзею. Пасля гэтага партрэт Сталіна заняў сваё пачэснае месца побач з партрэтамі Леніна і Лукашэнкі. На плошчы беларускіх гарадоў выйшлі прыхільнікі моцнай рукі.

Выяву Іосіфа Віссарыёнавіча можна было ўбачыць у іх загартаваных руках і падчас "главного праздника государства" 3 ліпеня. А можа, тое і не партрэт увогуле? Можа, гэта быў люстраны адбітак галоўнай трыбуны, што знаходзілася насупраць натоўпу? Як бы там ні было, падобнае "адлюстраванне" не выклікала абурэння ў прысутных. Сімвалічна і гарманічна яно ўплялася ў канву свята, пакідаючы балючыя пытанні.

Ці задумваліся вы, шаноўныя грамадзяне, чаму з такой апантанасцю кідаюцца пэўныя людзі сталага ўзросту ў змаганне за вяртанне мінулага? Як у апошні бой. Ці заглядвалі вы ў іх вочы? Ці бачылі ў іх поглядзе спагаду і хрысціянства? Ці глядзелі вы, як сціскаюць старэчыя рукі дрэўка іх сцяга ці партрэта куміра? Як зброю. Як штык. Ці аналізавалі вы, чаму так лёгка ад падтрымкі Кебіча яны перакінуліся на падтрымку Лукашэнкі? І перакінуцца да ўсякага, хто паабяцае не дапусціць цывілізаваны ўклад жыцця. Чаму так страшэнна не хочацца ім дэмакратызацыі нашага грамадства? Чаму свой эгаізм яны ставяць вышэй нават за клопаты пра светлую перспектыву ўласных дзяцей і ўнукаў? На мой погляд, аб'ектыўна напрошваецца адзін адказ: **яны ахвяры таго страшнага рэжыму.** Безумоўна, не тыя, хто прайшоў праз ГУЛАГ. Іншыя. Дыяметральна іншыя. Іх скажоная мараль не дазваляе пакаяцца, а боязь праўды працягвае засмоктваць у дрыгву грахоў.

Мне давялося назіраць паводзіны раз'юшанага чалавека, калі на яго па-бальшавіцку нецэнзурнае "дерьмократы" была выказана гіпотэза, што, хутчэй за ўсё, ён запляміў сябе ў сталінскі перыяд і гэтым тлумачыцца яго агрэсія. Далейшая рэакцыя старога нагадала брудны вясенні снег, які толькі што быў і — няма. Было відавочна, што сваёй версіяй суразмоўца "трапіў у дзесятку".

З адкрытых архіваў служб бяспекі ў былых рэспубліках СССР і сацыялістычных краінах Еўропы добра вядома, якая татальная сетка даносаў існавала ў 30—50-х гадах і якой шчыльнай яна была пазней для адсочвання канкрэтных сітуацый і канкрэтных асобаў. Цяпер да нас далятаюць гучныя палітычныя справы, выкліканыя рассакрэчваннем дасье ў Прыбалтыцы, Польшчы, Чэхіі, Балгарыі... У Беларусі ж за ўсё гэта бярэцца рэванш. Пакаянне ў нас не намячаецца. Мы і тут у сваім **руху назад спіной** адзіныя і непаўторныя. Цяжка нават уявіць, каб прэзідэнт хоць адной яшчэ дзяржавы дазволіў падчас афіцыйнага мерапрыемства такую ганьбу, як суседства свайго партрэта побач з партрэтам крывавага дыктатара. Усе постсавецкія краіны на ўзроўні дзяржаўнай палітыкі далі рэзка негатыўную ацэнку таго жудаснага таталітарызму, а 1997 абвесцілі годам-рэквіемам па ахвярах сталінскага генацыду. Усе, акрамя нас. А таму не выпадкова нядаўні артыкул першага пасла ЗША ў Беларусі Дэвіда Суорца, прысвечаны беларускай праблематыцы, названы "Неасталінскі закуток Еўропы" (надрукаваны ў адной з прэстыжных амерыканскіх газет).

Самае ж страшнае ва ўсім гэтым, што сыходзяць з нашай зямлі людзі, чыё жыццё пакалечыў той час, — зыходзяць у такім жа прыніжаным стане, у якім яны жылі. Зламанае юнацтва, кляймо праз усё жыццё, нерэалізаваныя магчымасці, не створаныя сем'і... **За што?!** Непасільнай ношай зноў насунуўся перыяд, калі нават атрыманая афіцыйная рэабілітацыя не абараняе, не забяспечвае бязбедную старасць, не стварае псіхалагічны камфорт і ў канцы жыццёвага шляху. Памнажаючы асабістыя і грамадскія грахі, на плошчах і трыбунах, як і раней, святкуюць іншыя.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Навіны з Літвы

У Вільнюсе закідалі каменнем казахскага дыпламата

Эпапея з нападам на замежных дыпламатаў у Літве, відаць, не закончылася. Позна вечарам 5 жніўня на вільнюскай Кафедральнай плошчы група маладых людзей закідала каменнем першага сакратара пасольства Казахстана Ярмака Таўрсагулава і яго сяброў.

Камісар паліцыі Генрыкас Суровічус заявіў, што пакуль не будзе называць прозвішчы затрыманых падазроных. Пацярпелы казахскі дыплямат таксама не схільны каменціраваць інцыдэнт. Паліцыі ён сказаў, што з'яўляецца сябрам Літвы і не хоча нагнятаць сітуацыю.

Супрацоўнікі паліцыі сцвярджаюць, што сур'ёзнай фізічнай шкоды казахскаму дыпламату не нанеслі.

ЭЛЬТА-БелТА.

Господина Радкова Олега Николаевича ждут в редакции газеты "Народная воля".
Обращаться в рекламный отдел.
Тел. 229-29-04.

Дзякуй!

Пан Айгнер з-пад Штутгарта ахвяруе на захаванне дэмакратыі ў нашай краіне сціплы ўзнос. З пенсіі...

Беларусь сапраўды стала "притчей во языцех" ва ўсім свеце. На жаль, з негатыўнага боку. Ну а мне тым не менш давялося выканаць прыемную місію — перадаць ахвяраванне пана Айгнера з далёкага нямецкага гарадка Рыдэрых, што паблізу Штутгарта, для падтрымкі дэмакратычнага руху ў Беларусі. Няхай яно і невялічкае, можна сказаць, чыста сімвалічнае, але ўжо сам факт сведчыць пра многае...

У 70-я гады гэты пан са сваёй жонкай наведаў Савецкі Саюз. Яны адпачывалі ля Чорнага мора. Там пазнаёміліся з адной савецкай сям'ёй, былі разам на пляжы, гутарылі, разважалі і... выпівалі разам. А потым раптам гэтая сям'я змяніла паводзіны і пачала пазбягаць немцаў. Аднойчы позна ўвечары ў нумар пана Айгнера нехта пастукаў. Ён адчыніў дзверы. Перад ім стаялі іх новыя рускія сябры, якія паведамілі, у чым справа — КДБ проста забараніў ім кантакты з немцамі. Але колькі яшчэ было патаемных начных сустрэч, шмат тостаў за мір і сяброўства! Але вось апошні свой тост пан Айгнер запомніў на ўсё жыццё: "Вып'ем за тое, каб мы маглі сустракацца і казаць усё адзін аднаму адкрыта, каб у вас была свабода, каб мы не хаваліся, як злачынцы".

Праз 25 гадоў, пасля халоднай вайны і пасля пацяплення адносінаў паміж Заходняй і Усходняй Еўропай, пасля перастроечнай эйфарыі і "бархатных" рэвалюцый у краінах сацыялістычнай садружнасці ў маі гэтага года пан Айгнер, якому зараз 70, наведаў Беларусь. Ён шчыра перажывае за нас і за нашу дэмакратыю і са сваёй пенсіі, колькі можа, ахвяруе, каб пад пагрозай не апынуліся ўсе тыя дэмакратычныя пераўтварэнні, якія пачаліся на былой савецкай прасторы, у тым ліку на Беларусі, пасля стварэння новых суверэнных дзяржаў. Няхай пашчасціць і Беларусі!

Скажам жа шчыры дзякуй і пану Айгнеру. Як казаў паэт, не пасылка дарагая, а братэрская любоў. Сапраўдныя чалавечыя пачуцці.

Вольга СЯРГЕЕВА.

Народная Воля 9 ЖНІЎНЯ 1997 г.

Погляд

Прышчэпка сталінізму

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прышчэпленая да беларускага ствала галінка набірае сілу. Вось ужо і з маладых пупышак пырснулі зялёныя лісцікі, якія пад ветрыкам новых гістарычных перамен найперш прашапацелі: "Прямое действие" не болтает, а действует. Действует круто. Ставит цель — добивается. Возникает преграда — преодолевает. Мешают противники — уничтожает". Як гэта ўжо блізка да вядомых матываў 60-гадовай даўніны!

Так выглядае кансалідацыя грамадства па-беларуску. Ад здзеку не могуць уберагчыся нават магілы. Нормай становіцца глумленне над месцамі масавых забойстваў рэпрэсаваных — у Чэрвені, Лошыцы, Курапатах. І ўсё гэта пад маўклівае адабрэнне беларускіх улад.

А між тым на радзіме бальшавізму-сталінізму ідзе падрыхтоўка да ўсерасійскай акцыі пакаяння. Яна адбудзецца ў кастрычніку ў Рэспубліцы Карэлія, дзе толькі што адкрыта чарговае месца расстрэлаў у патыліцу. Па падліках, там знайшлі вечны спачын каля 9 тысяч няшчасных. Але **хто мае права пазбаўляць будучыні беларускую нацыю, не дапускаючы пакаяння над парэшткамі дзесяткаў тысяч ахвяраў у Курапатах?**

І нарэшце... Амаль у той жа гістарычны момант, калі на "высокай нарадзе" ішло абмеркаванне, чым і як засеяць Беларускае Поле, рэальная жанчына расказала мне пра рэальныя падзеі з свайго жыцця. Нават на фоне ўсіх пачутых дагэтуль гісторый з сталінскіх часоў сімвалізм гэтага трагічнага эпізоду працінае да самых глыбінь душы. Уражвае, наколькі хісткая мяжа паміж жывёльным у чалавеку і чалавечым у жывёле. Так хацелася б цешыць сябе ілюзіяй, што хоць гэтая невыдуманая гісторыя вымусіць тых, хто сказаў прэзідэнту "давай сталинские времена", адклікаць сваё даручэнне...

...Яна нарадзілася ў 1939 годзе на Нясвіжчыне. За польскім часам бацька як самы адукаваны і гаспадарлівы быў абраны аднавяскоўцамі старастам (солтысам). Такое здаралася тады паўсюдна і амаль паўсюдна ў новай савецкай Беларусі скончылася аднолькава — пакараннем. На працу ў лагерах поўначы быў асуджаны і гэты канкрэтны солтыс. Жонка ж была адпраўлена на поўдзень — у Казахстан. На вольнае пасяленне. Разам з чатырма дзецьмі і толькі тым скарбам, які яны маглі перанесці ў руках. Іх малодшай дачушцы было ўсяго паўгода. Выжыць маці і дзеці маглі толькі адзіным чынам — наняцца на працу да кагосьці з мясцовых багацеяў, каму НКВД (не магу ўжываць назву гэтага органа па-беларуску) пастаўляў рабсілу. Жанчыне пашанцавала. Мясцовы бай быў зацікаўлены ў наборы чарговых работнікаў. Каб гэты шанц ні мог рэалізавацца, немаўлятка было схавана ў сундучок.

Іх пасялілі ў перапоўненую юрту для слуг. Зразумела, што праз некалькі дзён падман з дзіцем стаў вядомы. Абураны гаспадар прыдумаў сваё пакаранне — кінуў распранутую дзяўчынку ў сабачую юрту на кармленне сабакам. Жыццё маленькага апальнага чалавечка з чужой беларускай зямлі для яго нічога не каштавала. У стэпах вымiралі цэлыя сем'і вымушаных перасяленцаў. Зразумела, што стан маці дзяўчынкі ў той момант апісаць адэкватна немагчыма.

Зграя, нацкаваная гаспадаром, адной суцэльнай масай рынулася на бездапаможнае цельца. Але здарылася непрадказальнае! На абарону чалавечага існавання стаў сам стары важак зграі. Жывёльная агрэсія была спынена. Пасля гэтага і чалавек падараваў жыццё дзяўчынцы, але... у сабачым жытле. Маці дапускалася толькі ў рэдкія хвіліны адпачынку. Чацвераногі важак саграваў малую, калі было халадна, і аддаваў ёй лепшы кавалак бараніны, што перападаў ад гаспадарчага катла.

Так доўжылася два гады, пакуль жанчына не знайшла новае месца працы. Сабака некалькі разоў прыбягаў за дзесятак кіламетраў да выратаванага ім дзіцяці. Апошні раз яго ўбачылі абсалютна знясіленым і знямоглым. Дамоў ён ужо не вярнуўся. Гэта была яго развітальная сустрэча.

Беларуская Маці, дзякуючы сваёй працавітасці і мужнасці, зберагла жыццё ўсіх чатырох дзяцей. Яны вярнуліся на Радзіму у 1947 годзе...

Пасля ўсяго гэтага асабіста мне хочацца сказаць толькі адно. Божа літасцівы! Уратуй Беларусь ад паўтарэння такіх трагедый. Уратуй ад прышчэпак нават часткі падобнага. Зрабі, каб ніколі болей не здаралася так, што **жывёльная зграя разам з яе важаком выяўляла сябе больш гуманнай, чым чалавечая грамада разам са сваім лідэрам!**

Стала вядома

Сяргей Навумчык выступае ў абарону Тамары Віннікавай

Як стала вядома, палітэмігрант Сяргей Навумчык, знаходзячыся ў Празе, звярнуўся да сусветных праваабарончых арганізацый. Вось крыху скарочаны тэкст яго заявы:

"Больш як паўгода ў Мінску, у следчым ізалятары КДБ (у адрозненне ад іншых краін былога СССР, на Беларусі гэтая ўстанова нават не змяніла назву), знаходзіцца былая старшыня Нацыянальнага банка Беларусі Тамара Віннікава. Днямі суддзя Цэнтральнага раёна г.Мінска Віктар Крыкалаў адхіліў хадайніцтва адваката Гары Паганяйлы аб змяненні ёй меры ўтрымання і вызваленні яе са следчага ізалятара КДБ пад падпіску аб нявыездзе. Такое хадайніцтва адваката, між іншым, тлумачыцца яшчэ і тым, што сп. Віннікавай патрэбна неадкладная складаная хірургічная аперацыя, пасля якой, на думку спецыялістаў, нельга ўтрымліваць хворую ў антысанітарных умовах следчага ізалятара. У адваротным выпадку гэта можа прывесці да трагічнага выніку.

Трэба зазначыць, шо на Беларусі судовая сістэма, таксама, як і сістэма пракурорскага нагляду, знаходзіцца пад поўным кантролем прэзідэнта Лукашэнкі. Вядома, што ў свой час спадарыня Віннікава з'яўлялася адной з набліжаных да Лукашэнкі асобаў. На думку некаторых мінскіх назіральнікаў, Віннікавай могуць быць вядомыя некаторыя "чорныя" фінансавыя аперацыі Лукашэнкі і ягонага атачэння, — калі так, то жорсткае абыходжанне з арыштаванай з'яўляецца спосабам пазбаўлення ад непажаданай сведкі. У любым выпадку стан здароўя спадарыні Віннікавай робіць знаходжанне яе пад вартай небяспечным для жыцця.

Палітычная пазіцыя Тамары Віннікавай пад час яе працы ў якасці старшыні Нацыянальнага банка не выклікала сімпатыяў у дэмакратычных сіл Беларусі. Аднак палітычныя погляды чалавека не павінны быць прычынаю маўчання праваабарончых арганізацыяў, тым больш калі жыццё чалавека знаходзіцца пад рэальнай пагрозай, калі навідавоку — свядомае парушэнне ўладамі артыкула 7 ("Ніхто не павінен падвяргацца катаваннямі альбо жорсткаму, нечалавечаму абыходжанню") і артыкула 10 ("Усе асобы, пазбаўленыя волі, маюць права на гуманнае абыходжанне і павагу годнасці, якая належыць чалавечай асобе") Пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. У адваротным выпадку дзейнасць гэтых арганізацыяў набывае адценне "падвоенага стандарту".

Гэты зварот з прычыны яго тэрміновасці я пішу без узгаднення з кіраўніцтвам аўтарытэтных і ўплывовых арганізацый, сябрам якіх маю гонар з'яўляцца, пішу ад сябе асабіста. Тым не менш заклікаю міжнародныя і нацыянальныя праваабарончыя арганізацыі, якія атрымаюць гэты зварот, выступіць у абарону Тамары Віннікавай і патрабаваць ад прэзідэнта Лукашэнкі неадкладнага вызвалення яе з-пад варты".

Заўважым, з такой заявай да праваабарончых арганізацый Сяргей Навумчык звярнуўся не толькі як член сойму Беларускага народнага фронту, але і як член Беларускага Хельсінкскага камітэта.

Мнение

А ведь россияне отхватили украинской территории в три раза больше. Взамен Крыма...

В последнее время на радио, телевидении, в печати стали доминирующими сообщения, связанные с разделом Черноморского флота в Севастополе между Россией и Украиной. Однако кое-кому хотелось бы разделить не только флот, но и полуостров. И вот уже в открытую раздаются голоса о том, что Севастополь должен принадлежать России. Мотивы? Да это же, мол, город русской славы! И в передачах по российскому радио, где в прямом эфире на вопросы слушателей отвечают депутаты Госдумы, видные политики, писатели, редакторы газет, все еще звучат ностальгические нотки.

Въедливые радиослушатели спрашивают и отвечают на свой же главный вопрос: ситуация с Крымом и даже с... Аляской со временем может решиться так же, как и с Гонконгом. Вернули же его наконец-то Китаю.

И что же порой слышим в ответ от лиц, которые, казалось, должны в первую очередь просвещать людей? Они поддакивают, причем в такт всевозможным россказням, которые иначе и назвать нельзя, как дезинформацией населения.

В каждом конкретном случае была совершенно определенная ситуация и соглашение. Так, Гонконг был получен в аренду Великобританией у Китая на 99 лет с июня 1898 г. по июнь 1997 г. Нам пришлось быть свидетелями выполнения этого соглашения. Совершенно иная ситуация в отношении Крыма. С февраля 1954 г. Крымская область передана в состав УССР, как сообщалось тогда, "в целях лучшего территориального управления", "в связи с 300-летием воссоединения Украины с Россией" и т.п.

Ну чего только нельзя было сделать внутри когда-то единого государства! "Все вокруг колхозное — все вокруг мое" — было же это, было. Однако в акте передачи полуострова Украине Н.С.Хрущев оказался не только "страдающим волюнтаристом", как нам его представляют, но и прагматиком — он смотрел в будущее. Сейчас, когда Украина является самостоятельным, суверенным государством, к ней нельзя предъявлять никаких территориальных претензий, поскольку взамен Крыма российской стороне (а это районы Кубани, Ростовской, Белгородской, Курской областей) передали 74 тыс. кв. километров площади, что в три раза превышает территорию всего полуострова на Черном море. Выходит, все эти рассуждения, ведущиеся уже несколько лет, можно считать просто неграмотными. И как приятно было на фоне этих разглагольствований услышать из уст президента России Б.Н.Ельцина заверения о в том, что Россия никогда и ни при каких обстоятельствах не нарушит территориальной целостности Украины, ее суверенитет.

Общаясь с людьми, вступая в разговоры об "утраченных территориях", убеждаешься, как еще заблуждаются люди. Многие, например, считают и ожидают, что Аляска "обязательно" будет возвращена России. И в этом случае вопрос давно не стоит. По договору от марта 1867 г. она была продана Соединенным Штатам Америки за 7 млн. 200 тыс. долларов. Как говорится, комментарии излишни.

Виталий ЛАТУШКО, рабочий.

Минск.

Піржныя з "сюрпрызам"

Факты групавых харчовых атручэнняў гэтым летам, на жаль, не рэдкасць. Часцей за іншых падносіць "сюрпрызы" Віцебшчына. Вось і на гэты раз 4 і 5 жніўня ў інфекцыйнае аддзяленне Гарадоцкай райбальніцы з папярэднімі дыягназамі гастраэнтэрыт і сальманелёз змешчаны 12 жыхароў трох вёсак раёна. Устаноўлена, што прычынай атручэння сталі піржныя, выробленыя Гарадоцкім хлебазаводам.

Сяргей ЦІВАНАЎ, БелТА.

Зеркало

Жена и невеста на рынке труда остаются без места

Одной из болезненных проблем белорусского общества в последнее время становится безработица. На первый взгляд, ее уровень у нас достаточно низкий: по итогам прошлого года 3,9% к численности активного населения. Однако если учесть, что за 1996 год каждый седьмой потерял работу, а каждый третий рабочий и служащий находится, по оценкам специалистов, в сфере риска, то для нашей небольшой республики это уже много.

Особенно высоким является риск для молодежи и женщин (последние, кстати, среди работающих в народном хозяйстве Беларуси составляют 51,6%). Так, на 1 октября прошлого года в качестве безработных было зарегистрировано 5055 выпускников вузов и техникумов, из них — 3741 женщина (74%). Можно с полной ответственностью утверждать, что у безработицы на Беларуси женское лицо. Так, если в 1993 году среди безработных было 0,4% мужчин (в процентах к общей численности экономически активного населения) и 0,7% женщин, то по итогам 1996 года это соотношение стало 1:2, то есть среди безработных 1/3 составляют мужчины и 2/3 — женщины. Из каждых четырех безработных, ищущих работу свыше одного года,три женщины.

Что такое безработная женщина? Это прежде всего голодные глаза детей сегодня и боязнь заводить семью и детей завтра. Женщина у нас стала заложницей семьи. Бытовые услуги практически всем теперь не по карману. Поэтому и стирка, и химчистка, и ремонт, не говоря уже о прочих услугах, легли на плечи хозяйки дома. А на селе и того хуже — вся социальная инфраструктура практически перестала существовать, комплексные приемные пункты и комбинаты бытового обслуживания почти повсеместно закрыты. Какая уж тут конкурентоспособность женщины на рынке труда?

В мировой практике предельный критический уровень безработицы, в том числе и скрытый, составляет 8—10%. По оценкам экспертов Института экономических исследований Министерства экономики Беларуси, наша страна уже к началу 1995 года перешагнула 20-процентный рубеж незанятого населения. Скрытая безработица увеличивается значительно более быстрыми темпами, чем открытая, и становится самой насущной проблемой. Так, в крупнейшей отрасли автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения с начала 1997 года 60% рабочих отработали в режиме сокращенного рабочего дня, 22% рабочих были предоставлены отпуска без сохранения зарплаты. Для большинства предприятий стала нормой 4—3-дневная рабочая неделя.

Следует отметить, что безработного в Беларуси ожидает незавидная доля: пособие по безработице исчисляется исходя из минимальной заработной платы, которая уже давно утратила значение важнейшего социального норматива. Так, в декабре прошлого года средний размер пособий на одного безработного составил 9% по отношению к средней зарплате, или 133,5 тысячи рублей. В то же время по итогам минувшего года средняя зарплата в Беларуси была ниже минимального потребительского бюджета (СЗП — 1 205 000 рублей, МПБ — 1 240 000 рублей).

Официальные власти на словах понимают сложившуюся ситуацию. В "Основных направлениях социально-экономического развития Республики Беларусь на 1996—2000 годы", принятых на так называемом всебелорусском народном собрании перед референдумом 1996 года, говорится: "Ожидаются более высокие темпы высвобождения работников и увеличение численности впервые ищущих работу". Здесь же заявляется о поэтапном переводе скрытой безработицы в открытую. Для предотвращения социальной напряженности предусматривается разработка и реализация дополнительных мер по социальной защите безработных, по совершенствованию инфраструктуры рынка труда, повышению уровня информационного обеспечения населения и работодателей по вопросам занятости.

Заметьте, что в этой программе нет даже упоминания о проблемах трудоустройства женщин, и дальнейшие практические шаги официальных властей подтверждают, что женская безработица и социальная незащищенность женщины на рынке труда не являются предметом озабоченности руководства страны. Так, 17 марта 1997 года президентом издан Декрет номер 7 "О дополнительных мерах по обеспечению занятости населения". В нем директивно ограничивается безработица: в текущем году не допускается увеличение числа безработных свыше 130000 человек, а также вводится обязательная месячная норма участия в общественных работах. В случае невыполнения безработным нормы без уважительных причин выплата пособия приостанавливается.

Совет министров Беларуси в Постановлении "О порядке организации и условиях проведения общественных работ в Республике Беларусь" от 16 мая 1997 года номер 13 установил, что месячная норма обязательных общественных работ не может превышать 10 дней. Однако местные исполнительные комитеты устанавливают свои нормы, и у нас уже есть примеры, когда эта норма составляет 12 дней. Напомню, что данная правовая норма противоречит ст.41 Конституции Республики Беларусь и Закону "О занятости населения". Ст.41 Конституции гласит: "Принудительный труд запрещается, кроме работы или службы, определяемой приговором суда или в соответствии с законом о чрезвычайном и военном положении". Авторы Декрета и Постановления Совета министров при разрешении вопроса об организации общественных работ и приостановки выплаты пособия не выполнившим обязательную норму отработки полностью проигнорировали интересы женщин, в документах не зафиксированы такие существенные моменты, как пол, состояние здоровья, наличие малолетних детей, больных, инвалидов, требующих особого ухода.

Таким образом, принимаемые властями меры не способствуют реальному снижению безработицы и предотвращению социальной напряженности. С учетом того, что перечень общественных работ предусматривает уборку мусора и ремонт канализационных сетей, при мизерности пособия по безработице многие граждане в последнее время предпочитают не регистрироваться на бирже труда. Это единственный реальный результат действия Декрета номер 7.

Несомненно, проблемы безработицы в Республике Беларусь напрямую связаны со стабилизацией экономики и ее структурной перестройкой, с разработкой долгосрочной стратегии экономического роста. При этом, безусловно, должна учитываться общая демографическая ситуация в стране. Население Беларуси за минувший год сократилось на 30,3 тыс. человек, что связано с превышением числа умерших над родившимися на 37,8 тыс. человек. Перед республикой стоит задача повышения престижа семьи, ликвидации неравенства женщин в оплате труда, повышения конкурентоспособности женщин на рынке труда. По расчетам одних экспертов, при отсутствии социальной защиты женщины, семьи, материнства и детства к 2300 году население Беларуси перестанет существовать, другие же эксперты грозятся, что этот процесс закончится через 100 с небольшим лет. Но, зная белорусскую женщину, я им не верю. Наша женщина недоспит, недоест, но у нее будет "теплая хата, хлеб выпечен, вкусен квасок, здоровы и сыты ребята".

И все-таки — когда же будет замечена нелегкая женская ноша? Когда государство поможет женщине хранить огонь семейного очага?

Елена СКРИГАН, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва.

Пратэст

Мы абураны рэпартажам Беларускага тэлебачання!

Мы, навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэя, прагледзеўшы 4 жніўня а 21-й гадзіне рэпартаж Беларускага тэлебачання з пікету прадстаўнікоў так званага Беларускага патрыятычнага саюза моладзі каля будынка нашай навучальнай установы, былі абураны яго неаб'ектыўнасцю, прадузятасцю і лічым абразай беспадстаўныя выказванні пікетоўшчыкаў і каментатара сп. Л.Кавалёвай у адрас нашага ліцэя, і ў прыватнасці ў адрас нашага любімага выкладчыка сп. Л.П.Баршчэўскага.

Мы засяроджваем увагу на наступных лозунгах і выказваннях пікетоўшчыкаў:

1. *"Собственность комсомола — молодежным организациям".*

Будынак нашай навучальнай установы ніколі не належыў камсамолу, як пра тое сведчаць адпаведныя дакументы: да 1992 года гэта быў вучэбны корпус Інстытута паліталогіі і сацыяльнага кіравання Кампартыі Беларусі. У сувязі з падзелам былой партыйнай маёмасці распараджэннем Савета міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 студзеня 1992 года №30р, падпісаным сп. В.Кебічам, гэты будынак быў перададзены Беларускаму гуманітарнаму адукацыйна-культурнаму цэнтру, у складзе якога і існуе наш ліцэй.

2. *"Долой национализм в образовании!"*

З усёй адказнасцю заяўляем, што ў нашым ліцэі не прапагандуецца нацыяналізм, адукацыя ў нас грунтуецца на агульначалавечых каштоўнасцях і нацыянальнай культуры, што і запісана ў Законе "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

3. *"Спасем детей от БНФ".*

